obespecheniju-prodovolstvennoj-bezopasnosti_i_624305.html. – Дата доступа: 17.02.2013.
10. Союзное государство. Развитие и перспективы. 3-е издание, дополненное и переработанное. – Минск, БЕЛТА, 2012. – 80 с.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# ГАЗЕТА «СТАЛИНСКАЯ МОЛОДЕЖЬ» У СІСТЭМЕ ДРУКУ 30–40-х гг.: ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ

Да пачатку 40-х гг. XX ст. было ў асноўным завершана фарміраванне сістэмы маладзёвага друку. Створаны газеты і часопісы, разлічаныя на прадстаўнікоў розных узроставых катэгорый, сацыяльнага становішча, нацыянальнай прыналежнасці. Прэса для юнакоў і дзяўчат выдавалася і распаўсюджвалася на ўсёй тэрыторыі БССР. Так, з 1921 г. рэгулярна друкавалася газета «Чырвоная змена» (галоўнае камсамольскае выданне - орган ЦК ЛКСМБ), газета «Піянер Беларусі» (з 1929 г.), часопісы «Іскры Ільіча» (з 1926 г.), «Беларускі піянер» (з 1924 г.), «Малады араты» (да 1926 г.); выданні для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей «Дэр юнгер арбетэр» («Малады рабочы», выходзіла да 1936 г.), «Звезда млодзежы» («Зорка моладзі», выходзіла да 1927 г.), «Юнгер Ленінец» («Юны ленінец», выходзіла да 1938 г.). З пачатку 20-х гг. былі заснаваны мясцовыя маладзёжныя выданні: газеты «Искра Ильича», «Набат молодежи» (Гомель), «Юный творец» (Віцебск). Паступова была наладжана сістэма студэнцкага друку, у прыватнасці ў БДУ (першыя выданні: «Голас рабфакаўца» «Голос пролетарского студенчества», «Голос студента»). Тым не менш, да пачатку 40-х гг. многія з названых вышэй выданняў спынілі сваю дзейнасць, у той час як колькасць членаў камсамольскай арганізацыі ў БССР значна павялічвалася. Неабходнасць з'яўлення новага выдання была відавочнай.

10 красавіка 1938 г. выйшаў з друку першы нумар газеты «Сталинская молодежь». Рашэнне аб стварэнні выдання было прынята на сумесным пасяджэнні ЦК ЛКСМБ і Мінскага абласнога камітэта ЛКСМБ. З'яўленне новага выдання было выклікана ў першую чаргу адміністратыўна-тэрытарыяльнай рэформай, у выніку якой быў завершаны падзел тэрыторыі БССР на вобласці. Па гэтай прычыне газета атрымала статус Мінскага абаснога камсамольскага выдання.

З'яўленне новай камсамольскай газеты ў БССР было абумоўлена яшчэ і задачамі, якія ўскладвала партыйна-савецкае кіраўніцтва на моладзь. Па-першае, гэта яе аб'яднанне ў радах піянерскай і камсамольскай арганізацый. Па-другое, к 1930-м гг. у БССР была наладжана праца рабочых і сялянскіх карэспандэнтаў, што у далейшым павінна было забяспечыць рэдакцыі газет журналісцкімі кадрамі, змест выданняў – якаснымі матэрыяламі. Такім чынам, новая газета своечасова і вельмі актыўна ўключылася ў агульны працэс адлюстравання сацыялістычнай рэчаіснасці.

Выходзіла «Сталинская молодежь» спачатку тры разы на тыдзень (аўторак, чацвер, субота), у 1939 г. перайшла на двухразовы выпуск (аўторак, чацвер), друкавалася на рускай мове. Фармат А2 (фармат «Правды»). Тыраж складаў 20 тыс. экземпляраў. Рэдакцыя размяшчалася па адрасе: вул. Чырвонаармейская, 26. Кошт нумара складаў 10 капеек. Як і большасць газет у БССР, выдавалася ў тыпаграфіі газеты «Звязда». Адказнымі рэдактарамі ў 30–40-я гг. былі І. Стругаўшчыкоў, Ф. Канстанцінаў, В. Фесько.

У 1956 г. заснавальнікам «Сталинской молодежи» стаў ЦК ЛКСМБ, змянілася назва – «Знамя юности». У пасляваенныя гады газета была органам Савета Міністраў БССР, Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі, ГА «БПСМ», Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ГА «БРСМ».

З моманту заснавання прыярытэтнымі напрамкамі зместу выдання сталі пытанні, звязаныя з палітычнымі, эканамічнымі падзеямі ў краіне і свеце; адлюстраванне дзейнасці камсамольскіх аргнізацый у БССР і ў іншых рэспубліках Савецкага Саюза; агляд навін адукацыі, культурных і спартыўных падзей, дапамога моладзі ў прафарыентацыі.

У кантэксце сучаснасці змест «Сталинской молодежи» падаецца дастаткова цікавым па некалькіх прычынах. Па-першае, з гістарычнага пункту гледжання, паколькі чытач мае магчымасць даць уласную ацэнку асобным фактам і падзеям; па-другое, правесці параўнальны аналіз некаторых прыярытэтаў у змесце нумароў 30–40-х гг. і сучасных.

Першаснае значэнне ў сваіх матэрыялах «Сталинская молодежь» надавала актыўнай прапагандзе савецкага ладу жыцця. Так, газета змяшчала рубрыку «По земле советской», у якой былі прадстаўлены фотаздымкі (нават фотакалонкі) з розных гарадоў і мястэчак, фабрык і заводаў, калгасаў. Гэтая рубрыка мела падраздзел «По республикам Советов». Падбор менавіта пазітыўных фактаў і падзей дапамагаў у стварэнні вобразу вялікай

савецкай краіны і яе моладзі як магутнай стваральнай сілы, якая крочыць да шчаслівай будучыні. Для артыкулаў характэрна ўзнёсласць. У назвах шмат клічнікаў, дзеясловаў загаднага ладу (напрыклад, «Голосуйте за партию Ленина-Сталина! Голосуйте за кандидатов блока коммунистов и беспартийных!», «Молодежь! Шире социалистическое соревнование в честь Великого Октября!», 14 снежня 1940 г.).

Тыповымі для таго часу былі загалоўкі многіх публікацый: «Конституция победившего социализма», «Конституция братских народов», «Производственными победами встречают трудящиеся День Сталинской Конституции». Гэтыя артыкулы надрукаваны ў нумары за 5 снежня 1940 г. і прымеркаваны да святкавання гадавіны сталінскай канстытуцыі – «самага справядлівага закона вялікай краіны працоўнага народа». Такія матэрыялы дапамагалі фарміраваць уражанне аб працоўным чалавеку як важнай складовай вялікага працэсу пабудовы новага справядлівага грамадства. Увогуле тэма працы на фабрыках і заводах, у калгасах была адной з прыярытэтных. У параўнанні з ёй пытанні культуры і нават адукацыі адыходзілі на другі план. Так, практычна ў кожным нумары прысутнічалі матэрыялы кшталту «Повседневно заботиться о развитии общественного животноводства», «Ферма стала неузнаваемой», «Путь к высоким урожаям», «Успехи радуют» (снежань 1940 г.).

Міжнародная інфармацыя «Сталинской молодежи» была прадстаўлена ў рубрыцы «За рубежом». Навіны з замежжа пра падзеі англа-германскай вайны, грэка-італьянскай, пра прамысловы крызіс у ЗША прасякнуты крытыкай капіталізму. У той жа час менавіта праз гэты кантраст паміж падзеямі ў СССР і на Захадзе чытач усведамляў усе перавагі савецкага ладу жыцця, дзе самай вялікай каштоўнасцю з'яўляецца працоўны народ.

Так, прапагандзе менавіта рабочых прафесій на сваіх старонках «Сталинская молодежь» надзяляла вялікую ўвагу. Рукамі простага працаўніка створаны ўсе матэрыяльныя каштоўнасці, быць рабочым ці калгаснікам – гэта пачэсная праца, якой ганарацца не толькі самі прадстаўнікі гэтых прафесій, але і ўся савецкая краіна. Так, у тым жа 147 снежанскім нумары за 1940 г. газета змясціла вялікі матэрыял «Усилить подготовку девушек-трактористок», у якім заклікала дзяўчат ісці працаваць на трактарах. На сяле не хапала такіх спецыялістаў. Тут жа была змешчана падборка карэспандэнцый аб шчаслівых лёсах людзей, якія абралі гэтую прафесію. Акрамя таго, у газеце была пастаянная рубрыка «Жизнь

трудовой молодежи». У раздзеле «Жизнь пионеров» таксама распавядалася пра працоўныя подзвігі падрастаючага пакалення.

Шмат публікацый прысвечалася тэме спорту. СССР была адной з самых моцных спартыўных краін свету. Дасягненнямі савецкіх спартсменаў мы ганарымся і сёння. Практычна ў кожным нумары можна было ўбачыць матэрыял кшталту «Чтобы тело и душа были молоды, ты не бойся ни жары и ни холода, закаляйся, как сталь!» (23 снежня, 1940 г.) у рубрыцы «Физкультура и спорт». Так рэдакцыя агітавала моладзь займацца спортам, каб загартоўваць сябе, рыхтавацца да новых перамог, як у спорце, так і штодзённым жыцці.

Асветніцкія матэрыялы змяшчаліся ў рубрыцы «Страница знаний». Маладым людзям тлумачылі, як рыхтаваць сябе да сталага прафесійнага жыцця, што такое машына і як яна працуе, прапаноўвалі агранамічныя веды.

Дастаткова цікавай для сучаснага чытача падаецца рубрыка «Комсомол создает новый быт». Аўтары з захапленнем распавядалі пра новае і цікавае жыццё камсамольцаў і піянераў. Друкавалася шмат артыкулаў, у якіх расказвалася пра тое, як камсамольцы ладзяць вяселлі, адпачываюць. Асобна варта выдзеліць тэму барацьбы з негатыўнымі праявамі ў грамадстве: як уласна чалавечымі (гультайства, п’янства), так і грамадскімі (адмоўнае стаўленне да савецкай улады, рэлігійныя забабоны, самагонаварэнне). Так, на старонках газет фарміраваўся вопыт крытычнага стаўлення да асобных фактаў рэчаіснасці. У гэтай сувязі неабходна адзначыць, што менавіта ў наш час крытыка практычна знікла са старонак газет. Вельмі рэдка сёння можна прачытаць цікавы фельетон ці памфлет, хаця матэрыялу для журналістаў больш чым дастаткова.

Аб высокім узроўні «Сталинской молодежи» 30–40-х гг. сведчыць і тое, што аўтарамі многіх матэрыялаў былі класікі беларускай літаратуры: Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, П. Трус, К. Крапіва (вершы «Ціт заводзіць новы быт», «Будуйце лазні», «Свет у кутменш пакут», фельетон «Споведзь»), У. Дубоўка, М. Чарот. Пад псеўданімам «Сусед вясёлы» друкаваў у газеце свае апавяданні і фельетоны К. Чорны («Заработак», «Папоўскі вялікдзень»). Усе гэтыя творы былі змешчаны ў нумарах газеты за 1940 г.

Творчую старонку выдання дапаўняў штомесячны дадатак-брашура «Камсамольскі вечар», які быў карысным камсамольцам пры арганізацыі творчых вечароў, канцэртаў, пастаноўцы спектакляў. Тут у асноўным друкаваліся творы саміх аўтараў. Вось

некалькі прыпевак, складзеных камсамольцамі і змешчаных у 1940 г. у № 157 за 6 снежня:

«Эх, люблю хадзіць у клуб,
Там народу многа.
Я ўзяла савецкі шлюб
І ня веру ў бога».

«Эх, прыслалі к нам вагон
Зусім новенькіх машын.
Кінуў піць я самогон,
Куплю плуг і лемяшы».

«Сталинская молодежь», як і іншыя тагачасныя выданні, добра наладзіла зваротную сувязь з чытачамі. Газета змяшчала шмат інфармацыі пад рубрыкай «Сталинская молодежь» адказвае на пытанні моладзі». Пытанні былі самыя розныя: ад інфармацыі пра узаемаадносіны з бацькамі, (напрыклад, «Сталинская молодежь», адкажы, што рабіць такому хлопцу, які любіць камсамольскую арганізацыю, увесь аддаецца для выканання задач ЛКСМБ, але бацька не любіць свайго сына за гэта, не дае яму есці і нават выганяе з хаты» (1940, 6 снежня), да пытанняў аб палітычным становішчы ў свеце. Акрамя таго, друкавалася шмат лістоў чытачоў, дзе расказвалася аб поспехах у розных сферах жыцця («Достижения Слонимских кафельщиков», «Стахановцы советской торговли», 1940, 14 снежня ). У дадзеным выпадку неабходна адзначыць і той факт, што ў выданнях 20–40-х гг. менавіта чытачы (рабселькоры, селькоры, юнкоры, пікоры, ваенкоры) былі аўтарамі большасці газетных матэрыялаў. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу недахопам прафесійных журналісцкіх кадраў, паколькі сістэма журналісцкай адукацыі ў БССР толькі фарміравалася. З другога боку, менавіта гэтая акалічнасць уплывала на тое, што выданні былі цікавымі, эмацыянальна і інфармацыйна насычанымі, звернутымі менавіта да чалавека, зацікаўленымі дапамагчы яму ў вырашэнні праблем, чаго не скажаш пра сучасныя газеты для моладзі.

Так, моладзевая прэса па сваіх задачах, тэматыцы, праблематыцы выконвае шэраг вельмі важных функцый. У якасці асноўных выступаюць інфармацыйная, выхаваўчая, адукацыйная, пазнавальная, сацыяльная. Не менш важнае значэнне маюць такія функцыі, як культурна-адукацыйная, рэкрэатыўная. Вялікае значэнне моладзевыя выданні надаюць арганізатарскай працы, знаёмячы сваіх чытачоў з нормамі паводзін у грамадстве, калектыве, сям’і, дапамагаюць у выбары прафесіі. У гэтым кантэксце мы можам справядліва адзначыць, што змест «Сталинской молодежи», усе прыведзеныя вышэй прыклады і факты сведчаць аб высокім узроўні выдання. Усе вызначаныя функцыі былі паспяхова рэалізаваны рэдакцыяй праз цікавыя і змястоўныя матэрыя-

лы, якія спрыялі фарміраванню самых важных агульначалавечых каштоўнасцей: патрыятызму, павагі да працы.

Ніхто не стане аспрэчваць той факт, што шмат матэрыялаў «Сталинской молодежи» прысвячалася менавіта адлюстраванню савецкай рэчаіснасці, яе поспехаў і дасягненняў. Напрыканцы 30-х і ў 40-я гг. старонкі газеты былі запоўнены і выкрывальніцкімі матэрыяламі, у якіх размова ішла пра лёсы людзей, выпрабаванні, праз якія яны прайшлі ў сталінскіх лагерах. Тым не менш, нельга не заўважаць і тое, што менавіта выданні савецкай эпохі сталі лепшым ўзорам змястоўнасці, жанравай і стылёвай разнастайнасці, зразумеласці і даходлівасці да чытача. Не патрэбны ніякія сацыялагічныя апытанні, кантэнт-аналіз, веданне колькасці наведвальнікаў сайта газеты ў інтэрнэце, каб зразумець, што такая газета, як «Сталинская молодежь» («Знамя юности») у 30–40-я гг. была сапраўдным дарадцам і сябрам для многіх пакаленняў чытачоў.

*Літаратура*


1. Беларуская журналістыка /А.Г. Слука. – Мн.: БДУ, 2011. – 447 с.
2. Гісторыя беларускай журналістыкі:[вучэбны дапаможнік для факультэтаў журналістыкі ўніверсітэтаў] / Р.В. Булацкі, І.І. Сачанка, С.В. Говін. – Мн.: Выдавецтва БДУ, 1979. - 428, [2] с.
3. Комсомольская печать Белоруссии: проблемы становления, развития и ее роль в строительстве социализма, 1918-1941 гг. / Слука О.Г. – Ленингард, 1986, -42 с.
4. Марцелев, С.В. Печать советской Белоруссии: Ист. очерк / С.В. Марцелев. – Мн.: Беларусь, 1967. – 510, [1] с.
5. Слука, О.Г. Голос революционной молодежи / О.Г. Слука. – Мн.: БГУ, 1987. – 141 с.



**Татьяна Иванова**

*Институт педагогического образования и образования взрослых Академии педагогических наук Украины*


## ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ МЕДИАОБРАЗОВАНИЯ

В настоящее время практически во всем мире в образовательные программы подготовки будущих специалистов включено изучение нового предмета, который получил название «Медиаобразование / Медиаграмотность». Актуальность введения этой педагогической дисциплины обусловлена тем, что подрастающее поколение живет в эпоху бурного развития новых информационных технологий и источников получения знаний. По данным социологических ис-